# З УДЗЯЧНАСЦЮ АД УСЯГО СЭРЦА

***Юбілей Віктара Вінаградава, доктара педагагічных навук, прафесара, заслужанага работніка вышэйшай школы, аўтара першага ў практыцы савецкай школы падручніка па чарчэнні саюзнага значэння, былога рэктара (1978 – 1997 гады) і ганаровага прафесара ВДУ – адна са знакавых падзей гэтага лістапада, да якой, без перабольшвання, рыхтаваўся ўвесь універсітэт.***



Выкладчыкі і супрацоўнікі ВДУ дзяліліся ўспамінамі, выпускнікі дасылалі віншаванні, рэдакцыйна-выдавецкі аддзел рыхтаваў віншавальны альбом, супрацоўнікі «Мы і час» – газетны артыкул… Ды і ці магло быць падругому, калі ўлічыць, што Віктар Ніканавіч – педагог для некалькіх пакаленняў машэраўцаў, яго жыццё – яркі прыклад служэння навуцы, адукацыі, роднай установе вышэйшай адукацыі.

У сам дзень нараджэння прафесара, 3 лістапада, машэраўцы на чале з рэктарам Валянцінай Багатыровай накіраваліся ў госці да юбіляра, каб асабіста павіншаваць яго з днём нараджэння. Ганаровым госцем стаў і намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў Дурноў, які перадаў Віктару Ніканавічу падзяку ад старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь Наталлі Качанавай, віншаванні ад міністраў адукацыі і сувязі, кіраўніцтва горада і вобласці, прафсаюзнай арганізацыі. Вячаслаў Віктаравіч пажадаў юбіляру моцнага здароўя і бадзёрасці духа, падзякаваў за той фундамент, які быў ім у свой час закладзены, і на якім сёння стаіць віцебскі ўніверсітэт, актыўна развіваецца і прымнажае свае дасягненні.

Валянціна Васільеўна ў сваю чаргу ўручыла юбіляру віншавальны альбом, нумары газеты «Мы і час» і іншыя прыемныя падарункі.

«Сёння мы часта гаворым аб гістарычнай памяці, аб неабходнасці яе захавання, фарміраванні ў моладзі павагі да яе, – адзначыла Валянціна Багатырова. – Я ўпэўнена, што сёння асаблівы дзень, калі мы змаглі адчуць непаўторныя эмоцыі, далучыўшыся да віншавання Чалавека з вялікай літары, які ў свае 90 гадоў поўны сіл і энергіі, жадання гаварыць, дарыць цяпло, выступаць для моладзі асабістым прыкладам таго, як трэба клапаціцца пра месца сваёй працы, усё жыццё прытрымлівацца адной ідэі, хвалявацца не за сябе, а за тых, хто побач».

На імправізаванай пляцоўцы пад вокнамі юбіляра адбыўся невялікі святочны флэшмоб, падчас якога студэнты і творчыя калектывы ВДУ выканалі музычныя кампазіцыі, у тым ліку «Гімн Машэраўцаў».

«Сёння на вуліцы даволі прахладна, але мне цёпла і на душы, і ў сэрцы. Я ўдзячны вам за віншаванне, за тое, што прыйшлі, што памятаеце. Калі ласка, нікога не крыўдзіце і самі не трымайце крыўду ў душы. Тады побач з вамі заўсёды будуць радасць і дабрыня», – падзякаваў усім юбіляр.

**Здымак Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**

Як праходзіла віншаванне, глядзіце з дапамогай QR-кода.